## Па тваіх, Ільіч, запаветах

# 3. Адзінай сям'ёю

### ◆ АБ ЧЫМ РАСКАЗАЛА КНІГА НАРОДНАЙ СЛАВЫ



Яшчэ і цяпер многім баханцам добра прыпамінаецца канец 1929 і пачатак 1930 гадоў. Гэты перыяд знамянальны тым, што ў вёсцы арганізавалася, дагэтуль невядомая ім, калектыўная гаспадарка. Яна паслужыла прыкладам арганізацыі новага жыцця ў вёсцы. Першынцом новага быў калгас „Герой працы“. Спачатку гэта была невялікая арганізацыя з купкі людзей згуртаваных паміж сабою адзінай думкай, імкненнем.

Пачаўся калгас з 12 гаспадарак, якія абагульнілі сваю зямлю, коней, транспартныя сродкі. Членамі першай сельгасарцелі сталі былыя кавалерысты Дзяніс Якаўлевіч Касцюшкін і Мікіта Сямёнавіч Аўчыннікаў, браты Марк і Аляксей Кавалёвы, Панас Юр'евіч Касцюшкін, Карней Карпавіч Зубачоў, Васіль Несцяравіч Барысенка, Пётр Мелехавіч Казакоў, Захар Нікіфаравіч Кучанкоў.

На адным са сходаў члены сельскагаспадарчай арцелі пасля доўгага абмяркоўвання пытання аб абранні кіраўніка калектыўнай гаспадаркі рашылі вылучыць на гэту пасаду актыўнага змагара за ўладу народа Дзяніса Касцюшкіна. Яму першыя калгаснікі даручылі свой лёс, бо добра ведалі прынцыповы, справядлівы і настойлівы яго характар. У той час такія людзі былі вельмі патрэбны.

Вялікія цяжкасці перадольвалі першае праўленне і члены калгаса. Уступіўшы ў калгас, трэба было назаўсёды разлучыцца з некаторай асабістай уласнасцю, выпрацаваць у сабе неабходныя рысы калектывізму. Гісторыя патрабавала духоўнага перараджэння чалавека на сацыялістычнай аснове. І гэтага супольна дабіваліся будаўнікі калектыўнай гаспадаркі. У грамадскай працы актыўна ўдзельнічалі сем'і калгаснікаў. Асноўныя сельскагаспадарчыя работы выконваліся на конях, уручную. Кожны член арцелі цяпер усведамляў, што матэрыяльнае забеспячэнне сем'яў калгаснікаў залежыць ад той долі працы, якую ён унёс у агульную справу.

З рабочым часам ніхто не лічыўся. стараліся выконваць работы толькі якасна. Нярэдка, пры непаладках у рабоце, калгаснікі дапамагалі адзін другому. Пераадольваць цяжкасці станавілася ўсё лягчэй. Усё радзей даносіліся да іх вушэй насмешкі з боку незадаволеных калгасам аднавяскоўцаў. Многія з іх пачалі задумвацца над тым, як бы самому стаць калгаснікам.

Асаблівая цяга да калектыву праявілася ў канцы 1932 года. У гэты час у Баханах быў арганізаваны другі калгас „Новыя Баханы“. Першымі членамі яго сталі змагары за калектыўную гаспадарку Лявон Захаравіч Зубачоў, браты Яфім і Гаўрыла Зубачовы, Іван Ціханавіч Старасценка, Гаўрыла Несцяравіч Барысенка, Пётр Андрэевіч Рабцаў.

Аб перавазе калектыўнага вядзення гаспадаркі яны пераканаліся на вопыце калгаса „Герой працы“. Цяпер ужо нішто не магло стрымаць масавага ўступлення аднаасобнікаў у калгас. Да вясны 1933 года ў сельгасарцель „Новыя Баханы“ было прынята 45 сялянскіх сем'яў.

Адзінай калектыўнай сям'ёй пачалі ствараць для сябе дабраты члены абодвух калгасаў у Баханах. Перажывалі розныя нягоды. Самым цяжкім для іх быў 1933 год—год вялікіх нястач і галадоўкі. Але калектывісты добра ведалі, што гэта віна стыхіі, а не калгаснага ладу і настойліва змагаліся за хлеб. І праца іх акупілася.

Восенню 1934 года калгаснікі атрымалі на кожны працадзень па 2 кілаграмы зерня і па 5 кілаграмаў бульбы. Яны цалкам забяспечылі сябе прадуктамі першай неабходнасці.

У адрас праўленняў абодвух калгасаў усё больш паступала заяў ад застаўшыхся яшчэ не членамі арцелі сялян. Кожны прасіў аб прыняцці яго ў калгас.

Вялікую дапамогу ў будаўніцтве калгасаў аказвала дзяржава. Каб палегчыць работу ў паляводстве, сюды пачалі дастаўляцца машыны. Упершыню ў 1936 годзе на калгасныя палеткі выйшлі трактары. Кіраваць у той час складанымі механізмамі было даручана першым жанчынам-трактарысткам Фёкле Патапаўне Рабцавай, Домне Ермалаеўне Казаковай і мужчынам Антону Фёдаравічу Сёмачкіну, Пятру Мікітавічу Траханаву, Агафону Андросавічу Кастрову. Усе яны па рашэнню праўленняў калгасаў былі накіраваны на курсы трактарыстаў, якія ў той час былі адкрыты пры Хоцімскай МТС.

Калгасы кавалі свае кадры механізатараў, бо надыходзіў час тэхнічнага прагрэсу, калі асноўныя работы ў паляводстве павінны былі легчы на плечы машын. А для гэтага неабходны былі людзі, ведаючыя тэхніку. Такіх механізатараў і выхоўвалі калектывы калгасаў і выкладчыкі Хоцімскай МТС.

1936 год стаў годам укаранення механізацыі ў калгасную вытворчасць. Характэрны ён і тым, што ў сельскагаспадарчую вытворчасць пачалі ўкараняцца дасягненні навукі, павышацца культура земляробства. У калгасах прыступілі да ўпарадкавання земляў.

Раслі і ўмацоўваліся калгасы ў Баханах. Павялічваўся грамадскі статак, узрастала ўраджайнасць сельскагаспадарчых культур, расла эканоміка калгасаў. Усё больш дзяржава атрымлівала прадуктаў паляводства і жывёлагадоўлі ад калектыўных гаспадарак. Заможней зажылі калгаснікі.

Прадаўжальнікамі справы Дзяніса Касцюшкіна і Лявона Зубачова сталі Цімох Казакоў і Мікіта Аўчыннікаў. Шмат працы прыклалі арганізатары і кіраўнікі калгасаў, каб іх нашчадкі жылі ў дастатку.

Вялікую ўвагу ўдзяляла партыя прыцягненню мас да ўдзелу ў кіраўніцтве дзяржаўнымі справамі. У органы народнай улады выбіраліся людзі, дастойныя працягваць справу, пачатую У. І. Леніным па будаўніцтву сацыялістычнага грамадства. Давер'е народа ў 1939 годзе заслужыла прадстаўніца калгаса „Новыя Баханы“ трактарыстка Фёкла Патапаўна Рабцава. Яна была абрана дэпутатам абласнога Савета дэпутатаў працоўных. Так, згуртаваныя ў адзіную сям'ю патомныя хлебаробы будавалі калектыўныя гаспадаркі, працавалі ў міры і дружбе.

**І. Барысенка.**

**Барысенка, І.** Адзінай сям′ёю : аб чым расказала Кніга Народнай Славы / І. Барысенка // Шлях Кастрычніка.

*1929–1930 г.г. у вёсцы Баханы арганізавалася калектыўная гаспадарка.*